таму што любое пазнанне ёсць пазнанне з пэўнага пункту гледжання. Менавіта таму эстэтычную культуру асобы можна лічыць галоўным ачагом нараджэння культурнай патрэбнасці і асноўнай праявай этнакультурных магчымасцей.

**А.Я.Корсакава,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

# ГРАВЮРЫ М.ЖУКОЎСКАГА ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ ТЭАТРАЛЬНЫХ ПРЫМІТЫВАЎ АМАТАРСКАГА ТЭАТРА У.Ф.РАДЗІВІЛ

У вывучэнні тэатральных прымітываў Уршулі Францішкі Радзівіл неацэнную дапамогу аказалі гравюры М.Жукоўскага, выкананыя на медзі. Гэтыя гравюры ўпрыгожылі выданне «Камедый і трагедый...» У.Ф.Радзівіл, якое было надрукавана ў 1754 г. у друкарні Гершона Галеві з Жолквы. Яны не толькі змаглі перадаць наіўнае ўяўленне княгіні аб тэатры, але і дазволілі меркаваць аб арыгінальнай творчай манеры мастака. Мастак адлюстраваў у гравюрах сваё непасрэднае ўражанне ад пастановак, дэкарацый, створаных іншымі мастакамі, магчыма, і сам прымаў удзел у стварэнні гэтых дэкарацый.

«Зацвярджэнне фантастычнага тэатра-маскарада ў прыдворным жыцці арыстакратыі адлюстроўваюць не толькі сюжэты і сцэнарыі п'ес, апісанні свят і пастановак, але і працы рысавальшчыкаў», — адзначаў А.Кулагін (1, с. 114). Менавіта дзякуючы гравюрам сёння мы можам уяўляць характар пастановак, касцюмы, маляўнічыя дэкарацыі, тэатральныя абставіны Нясвіжскага аматарскага тэатра. Майстар перадаў не толькі сцэны са спектакляў, але і адлюстраваў вобразы наведвальнікаў, якія з захапленнем глядзелі пастаноўкі.

Гравюра да п'есы «Дасціпнае каханне» пераносіць нас у тэатр на адкрытым паветры. Наіўная па сваёй выяўленчай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мове, яна маляўніча і дакладна передае атмасферу спектакля. У афармленні спектакля мудрагеліста перапляліся розныя стылі і эпохі. Для ўвасаблення п'есы ў Альбе была створана дэкарацыйная ўстаноўка ў форме прамавугольнай пляцоўкі, загароджанай драўлянай аркадай, якая мела характэрныя для Адраджэння паўцыркульныя аркі. Замыкала такую пляцоўку сцяна з традыцыйнымі для тэатра барока нішамі-альковамі, меўшымі завяршэнні ў выглядзе дэкаратыўных аркушаў з валютамі. Кожная арка ўпрыгожвалася гербам — тыпічным атрыбутам сармацкай культуры. Пад аркай на пастаменце ўзвышаліся статуі.

Дзеянне п'есы адбывалася ў Егіпце, але на сцэне аб гэтым нічога не нагадвала. Для стварэння ўсходняга каларыту Уршуля, а ўслед за ёй на сваёй гравюры М.Жукоўскі паказалі Люцыдора ў доўгім парчовым халаце, што насілі на Усходзе. Каўпак ды вялікае пенснэ сведчылі аб вучонасці пастуха. За Люцыдорам рухаліся яго дочкі — пастушкі з «фантажамі» ў прычосках, пастаральнымі посахамі, упрыгожанымі стужкамі і кітайскімі ліхтарыкамі. Гістарычна дакладнаму касцюму не надавалася ўвага, а суседства розных касцюмаў па стылі ўспрымалася як належнае.

У п'есе «Гульня Фартуны» аўтар таксама пераносіць дзеянне ў Егіпет. Княгіня апранула егіпецкіх воінаў у ваенныя мундзіры XVIII ст. (іх гралі кадэты Рыцарскай акадэміі). Адлюстраваўшы на гравюры шчаслівы канец трагедыі — вяселле, мастак захаваў да нашых дзён нагляднае ўяўленне аб складзе знакамітага рагавога аркестра Радзівілаў. Менавіта для надання асаблівай урачыстасці і пышнасці шлюбнай цырымоніі княгіня, як гэта адбывалася ў найбольш урачыстых выпадках у самім Нясвіжскім замку, выводзіць на сцэну праслаўлены рагавы аркестр.

Спалучэнне этнаграфічна дакладных турэцкіх касцюмаў з уборамі камедыі дэль артэ мы бачым на гравюры М.Жукоўскага да п'есы «Несумленнасць у

пастцы». Гэта пацвярджае тое, што княгіня вольна злучала ў адным творы персанажы з розных крыніц. Імкненне да ўсходняй экзотыкі прысутнічае не толькі ў сюжэце, касцюмах, але і ў афармленні сцэны. Наколькі магчыма меркаваць па гравюры, сцэна была ўслана персідскімі дыванамі.

На некаторых гравюрах, напрыклад да п'есы «Дасціпнае каханне», мастак намаляваў і гледачоў. Яны сядзяць у ложы, засланай дыванамі, — магнаты, айцы-езуіты, афіцэры Нясвіжскага гарнізона, шляхта і простыя гараджане. Прытрымліваючыся прымітыўных прыёмаў пабудовы кампазіцыі, майстар парушыў законы перспектывы. Як іканапісец ці стваральнік прымітыўных сармацкіх партрэтаў, ён на сваіх гравюрах стварае значныя персанажы. Паказвае іх больш буйнымі ў адносінах да астатніх, не вытрымлівае прапорцыі, перспектыву, яго малюнкі маюць умоўна-схематычны характар.

Каб найбольш поўна перадаць казачны сюжэт і прадставіць гледачоў непасрэднымі ўдзельнікамі дзеяння, У.Радзівіл ставіць спектакль «Справа боскага наканавання» на адкрытым паветры, ля замка ў парку «Кансаляцыя». Як можна меркаваць па гравюры, дэкарацыямі да спектакля служылі дрэвы, на заднім плане — палац. У адпаведнасці са сваімі наіўнымі ўяўленнямі праўдзівасці дзеяння княгіня ўводзіць у спектакль натуралістычныя дэталі: каралевіч Анціохус узяў з сабой на паляванне зграю паляўнічых сабак (з псярні Радзівілаў); прынцэсу Юлію, якую імкнулася згубіць злая маці, каралевіч знаходзіць спавітай і ... павешанай на дрэве.

Нягледзячы на прымітыўны характар гравюр, яны цікавыя для нас і з пункту гледжання перадачы навакольнага асяроддзя, дакументальнасці архітэктурных пабудоў таго часу. Так, напрыклад, на гравюры «Дасціпнае каханне» можна разгледзець частку двара кадэцкага корпуса са сценамі, з вялікай колькасцю амбразур для мушкетаў. Фрагменты архітэктурных пабудоў Нясвіжа, у тым ліку і Фарны касцёл, бачны на гравюрах да п'ес

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Любоў — цудоўная майстрыха», «Суддзя без розуму», «Каханне — зацікаўлены суддзя».

Мяркуючы па гравюрах, у парку была пастаўлена і п'еса «Золата ў агні». Падобныя ландшафтныя дэкарацыі ў парку «Кансаляцыя» прысутнічалі і на гравюры «Гульня Фартуны».

На гравюры да п'есы «Суцяшэнне пасля клопатаў» адлюстравана ваенная карусель (так зваліся фігурныя скачкі і ваенныя практыкаванні, якія кадэты выконвалі для гледачоў). М. Жукоўскі на сваёй гравюры ў наіўнай манеры намаляваў гледачоў, якія сабраліся ў Рыцарскай акадэміі на спектакль і з цікавасцю назіраюць з вокнаў за спаборніцтвамі. Асаблівая каштоўнасць гэтай гравюры ў тым, што толькі на ёй захаваўся выгляд будынка тэатра «Кансаляцыя» (пазней гэта пабудова была знішчана).

Акрамя пастановак на адкрытым паветры, Уршуля ставіла свае п'есы і ў памяшканні — у павільёне. Напрыклад, для стварэння дэкарацый да п'есы «Суддзя без розуму» княгіня выкарыстала сімультанны прынцып пабудовы школьнай п'есы. Гэты факт вельмі добра бачны на гравюры да п'есы. Уршуля Францішка падзяліла сцэну на тры часткі, кожная з якіх вызначала месца дзеяння: капліца, турма і кухня.

Характэрныя пампезнасць, дэкаратыўнасць замкавага тэатра У.Радзівіл патрабавалі для свайго ўвасаблення розныя сродкі інсцэнізацыі і тэхнічнай базы. Так, для пастаноўкі оперы “Шчаслівае няшчасце” былі створаны спецыяльныя машыны, пры дапамозе якіх на заднім плане сцэны перамяшчаліся караблі. Таксама была створана спецыяльная фура з фігурай быка, які на сваёй спіне адвозіў выкрадзенае ў Еўропу.

Для пастаноўкі п'есы «Убачанае не мінае» была створана пляцоўка на плато, якую абрамлялі з трох бакоў кулісы-баскеты са стрыжанай зеляніны. Падобныя баскеты былі папулярны ў Версалі і ў Аўстрыі XVIII ст. На гравюры мы бачым прадстаўленне з боку сцэны: сярод баскет гутараць пастухі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне гравюр дае магчымасць меркаваць аб дэкарацыях Нясвіжскага тэатра. Як адзначала Э.Арава (2, 55), выдзяляюцца тры групы дэкарацый, наіўных па сваіх сцэнаграфічных прыёмах: баскетныя, на адкрытым паветры; нязменныя архітэктурна-арачныя, з відамі Нясвіжа і Альбы як фону; павільён, у тым ліку сімультанны.

Гравюры дапамагаюць скласці ўяўленне аб Нясвіжскім аматарскім тэатры, яго эклектычнай прыродзе, аб злучэнні розных стыляў і напрамкаў як у пабудове, так і ў пастаноўцы п'ес.

Гравюры М.Жукоўскага адкрываюць яшчэ адзін бок існавання мастацкага прымітыву, які яскрава і самабытна назіраецца ў наіўнай творчай манеры аўтара. Магчыма, мастак быў знаёмы з кніжнай графікай, але, як пісаў А.Кулагін, «мастак імкнуўся прадставіць кніжную арнаментальную графіку як мага больш ненатуральна, як не бывае і не сустракаецца ў прыродзе» (1, с. 100).

Тэатральныя гравюры М.Жукоўскага як узоры мастацкай культуры эпохі барока пацвярджаюць, што прымітыў існаваў у якасці спецыфічнай формы амаль ва ўсіх відах і жанрах мастацтва і з'яўляўся неад'емнай часткай жыцця шляхецка-сармацкага грамадства на тэрыторыі Беларусі, дакументальным сведчаннем характару «наіўных» пастановак аматарскага тэатра, створанага ў першай палове XVIII ст. у Нясвіжы княгіняй Уршуляй Францішкай Радзівіл.


*1. Кулагин А.Н.* Архитектура и искусство рококо в Белоруссии: в контексте общеевропейской культуры. — Мн., 1989. — 240 с.

*2. Арава Э.В.* Нясвіжскія тэатральныя гравюры // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі . — 1972. — № 2. — С. 53—55.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ